венной войны, но и восстановить утраченный когнитивный потенциал отдельно взятого музейного предмета. Результаты проведённой реконструкции и анализа источника были внедрены в работу Гомельского дворцово-паркового ансамбля и могут использоваться при дальнейшей научной и экспозиционно-выставочной работе.


1. Gomel 012 [Electronic resource] // WWII Aerial Photos and Maps. – Mode of access: http://www.wwii-photos-maps.com/targetrussia/citynamesbeginningg/citynames-gele-gust/slides/Gomel%20%20012.html. – Date of access: 14.02.2019.
2. Overlay Indexes for Aerial Photography of the Defense Intelligence Agency, 1935 – 1971 [Electronic resource]. – Mode of access: https://catalog.archives.gov/id/306062. – Date of access: 14.02.2019.
3. WWII Aerial Photos and Maps [Electronic resource]. – Mode of access: http://www.wwii-photos-maps.com/. – Date of access: 14.02.2019.
4. Городецкий, В. К истории трофейных аэрофотоснимков Витебска 1941 г. из Национальной администрации архивов США / В. Городецкий, В. А. Шишанов // Актуальные проблемы источниковедения : материалы IV Международной научно-практической конференции к 420-летию дарования городу Витебску магдебургского права, Витебск, 20–21 апреля 2017 г. / Витеб. гос. ун-т ; редкол.: А. Н. Дулов и М. Ф. Румянцева (отв. ред.) [и др.]. – Витебск : ВГУ имени П.М. Машерова, 2017. – С. 103–107.
5. Неизвестный фотограф. Аэрофотосъёмка Гомеля, 18 августа 1941 г. [фотография] // Фонды музея Гомельского дворцово-паркового ансамбля. – КП 11740.
6. Рудак, А. Д. Экзамен на зрелость / А. Д. Рудак. – Минск : Беларусь, 1981. – 287 с.



**Новікаў С.Я.**


## КРЫНІЦАЗНАЎЧЫ ПАТЭНЦЫЯЛ НЯМЕЦКАМОЎНЫХ ДАКУМЕНТАЎ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ТРАФЕЙНАЙ КАЛЕКЦЫІ ГЕНЕРАЛЬНАГА КАМІСАРЫЯТА “БЕЛАРУСЬ”)

Аб’ектам даследавання з’яўляецца крыніцазнаўчы патэнцыял арыгінальных матэрыялаў трафейнай Калекцыі дакументаў Генеральнага камісарыята «Беларусь» [1]. У якасці прадмета крыніцазнаўчага аналізу вызначана выяўленне максімальна поўных гістарычных звестак з нямецкамоўных крыніц, датычных аднаго з важных аспектаў гісторыі ваеннай паўсядзённасці ў Мінску – асобнай карціны вытворчай кааперацыі гарадскога грамадзянскага насельніцтва з акупацыйнымі органамі ў сферы працоўных адносін.

З гэтай нагоды нагадаем чытачу, што з восені 1941 г. і да вясны 1944 г. амаль ¼ частка тэрыторыі передваеннай Беларускай ССР з насельніцтвам 3 138 256 чалавек (звесткі па стане на пачатак снежня 1941 г.) утварала Генеральную акругу «Беларусь», уключаную ў склад Рэйхскамісарыяту «Остланд» [2, с. 171]. Паводле нямецкіх звестак, на гэтай тэрыторыі прыжывала толькі чвэрць насельніцтва, такая ж яго колькасць знаходзілася на тэрыторыі Рэйскамісарыята «Украіна», яшчэ палова насельніцтва – на тэрыторыі тылавога раёна групы армій «Цэнтр» [3, с. 106]. Адзначым, што адначасова тэрытарыяльна і адміністрацыйна Мінск-горад і Мінск-вобласць разам з іншымі 9 акругамі – Баранавічы, Барысаў, Вілейка, Ганцавічы, Глыбокае, Ліда, Навагрудак, Слонім, Слуцк – знаходзілася ў падпарадкаванні Генеральнага камісарыята «Беларусь» на чале з В. Кубэ [4, S. 90].

У Мінску з першых дзён акупацыі былі сканцэнтраваны не толькі важнейшыя ваенныя, паліцэйскія, адміністрацыйныя, але і гаспадарчыя акупацыйныя органы кіравання. Аб дзейнасці апошніх на тэрыторыі акругі сведчаць амаль трацiна матэрыялаў згаданага фонду. Некаторыя беларускія і нямецкія гісторыкі звярталіся да гэтых матэрыялаў, але часцей за ўсё да «Пратакола нарады гебітскамісараў» у Мінску 8–10 красавіка 1943 г. [5]. На падставе звестак з гэтага дакумента паспрабуем аднавіць карціну падзей з гісторыі працоўнай паўсядзённасці, у фокус якой вылучым адну з галоўных практык выжывання людзей у катастрафічных умовах акупацыі горада шляхам працоўнай кааперацыі мясцовага насельніцтва.

Заўважым, што ў апошні час у беларускай гістарыяграфіі двойчы рабіліся спробы аналізу гістарычных матэрыялаў гэтай справы не толькі з мэтай раскрыцця інфармацыйнага патэнцыялу дакумента [3], але і выяўлення яго археаграфічнага значэння [6]. Увядзенне ж яго ў шырокі ўжытак стварае спрыяльныя ўмовы для атрымання адказаў на некаторыя пытанні маладаследаванай сацыяльнай гісторыі, у тым ліку аб пошуку стратэгій выжывання беларускіх грамадзян у

Рэпазіторый ВДУ

экстрэмальных сацыяльна-эканамічных умовах акупацыі. У гэтай сувязі навуковы аналіз фактаў, якія знайшлі замацаванне ў «Пратаколе», садзейнічаюць высвятленню як стратэгій выжывання грамадзянскага насельніцтва, так і раскрыццю маштабаў выкарыстання наяўнай працоўнай сілы (кваліфікаваных работнікаў (спецыялістаў), рабочых (рознарабочых) і служачых) у якасці рабочай сілы як у нямецкіх цывільных службах, так і занятых на розных ваенных, вытворчых аб’ектах і прадпрыемствах Мінска.

Прыведзены дакумент стварае прыдатную глебу для фарміравання гістарычнага наратыву, на аснове якога можна, з аднаго боку, працягнуць дакументальнае ўдакладненне маштабаў выкарыстання мясцовай рабочай сілы. У гады акупацыі для Мінска вызначальнай адметнасцю з’яўлялася канцэнтрацыя ў горадзе 150 буйных прамысловых прадпрыемстваў, у тым ліку: 20 металургічных, 14 тэкстыльнай і скуранай прамысловасці. 15 папярова-цэлюлозных і паліграфічных, 21 транспартнага прадпрыемства, 3 электрастанцый, 41 будаўнічага прадпрыемства, 6 дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў, 13 прадпрыемстваў харчовай прамысловасці, 7 прадпрыемстваў хімічнай прамысловасці і вытворчасці будматэрыялаў, а таксама 180 ваенных і цывільных устаноў. З другога боку, важнай адметнасцю можна назваць тое, што пры 105 тысячах жыхароў Мінска больш паловы з іх – 56 тысяч стаялі на картачным уліку. Адпаведна выдадзеным пасведчанням, працавала толькі трэць – 35 тысяч чалавек, да таго ж яшчэ 8500 яўрэяў і 3190 ваеннапалонных. Розніцу паміж узятай на ўлік працоўнай сіла і працуючымі складалі непрацаздольныя, дзеці, тыя, хто чакаў доўгатэрміновую работу, а таксама выкарыстання ў гаспадарчых службах вермахта. Апошнія былі выяўлены ў асобных вайсковых часцях вермахта, але без адпаведнай рэгістрацыі на біржы працы. У пачатку 1943 г. асобную вастрыню у горадзе склала незабяспечанасць 6000 кваліфікаванымі рабочымі і прыкладна 2–4 тысячамі некваліфікаванымі [3, с. 154].

Фатальны недахоп рабочай сілы на той час стаў характэрнай прыкметай фактычна для ўсіх сфера гарадской гаспадаркі. Недахоп кваліфікаваных спецыялістаў з’яўляўся відавочным фактам для цывільнага кіраўніцтва горада [3, с. 143]. З дакументаў вынікае, што ў канцы 1942 г. года недахоп рабочай сілы ў Мінску толькі на прамысловых прадпрыемствах складаў амаль 24 тысячы чалавек, з якіх – 4568 у будаўнічай галіне, 4365 – на прадпрыемствах ваеннага прызначэння, 3323 – на аб’ектах сельскай гаспадаркі і ў лясной прамысловасці, 2882 – на прадпрыемствах па нарыхтоўцы торфу, 2297 – у транспартнай службе, 2033 – у ваенна-будаўнічай арганізацыі «Тодт», 677 – на прадпрыемствах металаапрацоўкі, 180 – дрэваапрацоўкі, 95 – у хімічнай прамысловасці і 3128 чалавек – на іншых прадпрыемствах і вытворчасцях [7, Bl. 4].

Паводле ацэнкі нямецкага даследчыка К. Герлаха, доля працуючых у адносінах да агульнай колькасці насельніцтва ў асобных гарадах акупаванай тэрыторыі Беларусі была *«не самай высокай»* (выдзелена мной. – С.Н.) і складала: у Барысаве – 33%, Оршы – 45%, Суражы і Гарадку – адпаведна 38% и 47,5% [8, S. 456]. У тылавым раёне групы армій “Цэнтр”, дзе дзейнічала гаспадарчая інспекцыя “Цэнтр”, агульная занятасць складала 41 %, пры гэтым суадносіны колькасці мужчын і жанчын складалі 2 да 3 [8, Bl. 359]. У той жа час у Мінску гэта доля непасрэдна занятых на працы на розных гаспадарчых, адміністратыўных і прамысловых аб’ектах горада складала амаль 44,5%, тады як доля працаздольных, хто знаходзіўся на ўліку ў акупаваным горадзе, у пачатку 1943 г. дасягнуў самага высокага паказчыка – 53,3% (падлікі аўтара. – С.Н.).

Заўважым, што прыведзеныя колькасныя паказчыкі раскрываюць чытачу толькі адзін сюжэт з рэальнай карціны выкарыстання мясцовага грамадзянскага насельніцтва ў якасці працоўнай сілы, тады як сацыяльныя сюжэты гісторыі працоўнай паўсядзённасці пакуль што застаюцца зусім не даследаванымі. Як нам бачыцца, адным з самых важных сюжэтаў павінен з’яўляцца сацыяльны аналіз, г. зн. якасны паказ складу занятых, пераліку пасад і прафесій працуючых, узроставых і палавых звестак, памераў заробку і г.д. Інакш кажучы, на цяперашні час неабходна паспрабаваць скласці агульны сацыяльны партрэт працоўных рэсурсаў горада, задзейнічаных у якасці працоўнай сілы ў акупаваным Мінску?

З выяўленых аўтарам гэтых радкоў толькі ў апошні час даных паспрабуем зрабіць пакуль частковую замалёўку карціны працоўнай паўсядзённасці ў Мінску, зробленую на падставе аналізу выбаркі асабістых звестак тых, хто не толькі працаваў па найме, выконваў службовыя абавязкі, але і атрымліваў заробак у акупацыйнай нямецкай установе. Возьмем 92 запісы, што складае толькі дзесятую частку тых, хто ў пачатку 1943 г. быў задзейнічаны на розных пасадах



Рэпазіторый БДУ

непасрэдна ў вышэйшым органе цывільнай улады ў Мінску – Генеральным камісарыяце «Беларусь» [10, Bl. 12–29].

Першы элемент замалёўкі гісторыі працоўнай паўсядзённасці для гэтай катэгорыі занятых складае пералік аб'ектаў, на якіх былі заняты і працавалі ў акупаваным горадзе: гэта аддзелы і службы Генеральнага і акруговага камісарыятаў, у тым ліку – агульны і фінансавы аддзелы, аддзел палітыкі і эканомікі, акруговы суд, каманда па ўзбраенні, ветэрынарныя служба, насенная станцыя, гаспадарка па даследаванні садавіны і гародніны, іншыя даследчыя станцыі, бібліятэка, шматлікія шпіталі, атэлі, гарадскія службы, сталоўкі, у тым ліку для яўрэяў, транспартныя службы, казіно, гарадская турма і інш.

Другім элементам з'яўляецца падзел складу працуючых па *полу* і *ўзросце*. З праведзенай выбаркі даных вынікае, што суадносіны па полу занятых складалі 1 жанчына да 2,5 мужчын. У нашым выпадку размова ідзе пра ўзрост працуючых, якіх можна згрупаваць па наступным крытэрыі: І групу складаюць народжаныя ўключна да 1900 года, якіх было 41,6 %, у тым ліку: з 1861 па 1870 гг. – 1,4%, з 1871 па 1880 гг. – 8,9%, з 1881 па 1890 гг. – 11,9%, з 1891 па 1900 гг. – 19,4%; ІІ групу складалі народжаныя пасля 1901 года, у тым ліку: з 1901 па 1910 гг. – 14,9%, з 1911 па 1920 гг. – 11,9%, 1921 па 1928 гг. – 31,3 %. Такім чынам, з прыведзеных звестак вынікае, што самую вялікую колькасць занятых на працы складала ўзроставая група маладзі, узрост якой вагаўся ад 15 да 21 года. Самым сталым па ўзросце быў 77-гадовы статыст, які працаваў у акруговым судзе. Ва ўзросце 15 гадоў працавалі вучні краўца і сталяра, а таксама каваль і аграном [10, Bl. 12–29].

У пераліку працоўных пасад, службовыя абавязкі якіх у Генеральным камісарыяце выконвалі жыхары акупаванага Мінска, у дакуменце зафіксаваны наступныя: паліцэйскі, бібліятэкар, прыбіральшчыца, інжынер, сакратар, статыст, рабочы, аграном, машыністка, парцье, апальшчык, вахцёр, рэвізор, кур'ер, суддзя, лабарант, кухонны рабочы, повар (старшы повар), перакладчык, афіцыянт, гандляр, пастух, тэхнік, кравец, шафёр, прапагандыст, доктар, сталяр, электрамеханік, аўтаслесар, вядучы служачы, палявы работнік, геолаг, пакаёўка, будаўнічы тэхнік, архівіст, рабочы, мастак, хімік, радыёмеханік, каваль, рамізнік і інш. На жаль, прыведзеная выбарка не дазваляе зрабіць поўны аналіз прафесійнай занятасці. Тым не менш з выбаркі вынікае, што ў пераліку працоўных пасад вылучаліся дзве самых вялікіх групы, якія складалі – прыбіральшчыцы, хто працаваў у нямецкіх шпіталях, і тыя, хто служыў у Мінскай турме і ў турме ў Бараўлянах у якасці паліцыянтаў [10, Bl. 12–29].

Самым цікавым аспектам у карціне працоўнай паўсядзённасці Мінска, як нам бачыцца, можа з'ўляцца каштарыс памераў месячнага заробку тых, хто працаваў на розных пасадах і атрымліваў матэрыяльнае заахвочванне ў выглядзе грашовага ўзнагароджання ў нямецкіх марках (DM). Сумы заробку пададзены без ўліку адлікаў падаткаў. Адразу ж адзначым, што асноўная маса працуючых атрымлівала заробак памерам да 100 нямецкіх марак, у тым ліку: ад 13 да 20 DM – 11,9%, ад 21 да 30 DM – 13,4%, ад 31 да 40 DM – 14,9%, ад 41 да 50 DM – 13,4%, ад 51 да 60 DM – 7,4%, ад 61 да 70 DM – 1,4%, ад 71 да 80 DM – 4,4%, ад 81 да 90 DM – 7,4% і ад 91 да 100 DM – 7,4%. Звыш 100 DM атрымлівала толькі крыху менш за пятую частку занятых, у тым ліку: ад 111 да 120 DM – 2,9%, ад 121 да 130 DM – 5,9%, ад 131 да 140 DM – 1,4%, ад 141 да 150 DM – 1,4%, ад 171 да 180 – 7,4%, ад 191 да 200 DM – 1,4% і ад 211 да 220 DM – 1,4%. У абсалютных лічбах размова ў апошніх двух выпадках ідзе пра служачага акруговага суда і доктара, тады як мясцовыя паліцэйскія ў мінскай турме штомесячна атрымлівалі 130 DM [10, Bl. 12–29].

Такім чынам, праведзеная выбарка звестак з'яўляецца пэўнай асновай для раскрыцця элементаў агульнай сацыяльнай панарама гісторыі працоўнай паўсядзённасці насельніцтва ў акупаваным Мінску на прыкладзе аналізу наяўных звестак тых, хто на розных пасадах стала працаваў у Генеральным камісарыяце «Беларусь. Але і ў новых дакументах мы пакуль знаходзім адказы на іншыя важныя пытанні, у тым ліку: аб матывах, умовах, абставінах працы і інш., а галоўнае – прычынах працоўнай кааперацыі з акупантамі. У той жа час з прыведзеных хоць і няпоўных звестак можна казаць пра выяўленне вельмі важных звестак для стварэння агульнай карціны працоўнай паўсядзённасці мясцовага грамадзянскага насельніцтва ў акупаваным Мінску. Але на парадку дня застаецца задача аб напісанні поўнай карціны гэтай гістарычнай з'явы з акцэнтам на сацыяльных аспектах прыцягнення працоўнай сілы як у Мінску, так і на тэрыторыі Беларусі 1941–1944 гг. Гэта асабліва важна, калі ўлічыць рэальныя

Рэпазіторый ВДУ

маштабы мясцовай рабочай сілы, занятай у акупаванай гаспадарцы. Напрыклад, толькі ў пачатку 1943 г. аддзелам выкарыстання працоўнай сілы Генеральнага камісарыята «Беларусь" было ахоплена 650 тысяч чалавек, 470 тысяч ці 72% з іх былі заняты ў сельскай гаспадарцы [3, с. 113]. Датычны тэрыторыі акупаванай Беларусі, гэта лічба перавышала 1,5 млн. чалавек [11, с. 21].

Такім чынам, сацыяльны партрэт мясцовых работнікаў, створаны на прыкладзе толькі адной катэгорыі мясцовага насельніцтва, занятага на працы ў германскай установе акупаванага Мінска, з'яўляецца пэўным люстэркам таго факта, што падобная карціна выкарыстання мясцовай працоўнай сілы пакуль не стала прадметам спецыяльнага даследавання беларускай гістарыяграфіі. Выяўленыя мазаічныя звесткі пра мясцовую працоўную сілу, занятую на розных пасадах у Генеральным камісарыяце «Беларусь», складаюць вельмі важны гістарычны фрагмент, без якога гісторыя германскай акупацыі па цяперашні час застаецца як бы абязлічанай, у ёй фігуруюць толькі лічбы, але фактычна няма імёнаў, няма людзей. Што сёння не скажаш пра беларускіх остарабайтараў, шматлікія ўспаміны якіх хоць часткова дазваляюць зусім інакш убачыць праблему прымусовага выкарыстання беларускага грамадзянскага насельніцтва на працы ў рэйху.

Інакш кажучы – няма ў беларускай панараме працоўнай паўсядзённасці пакуль не стае поўнавартаснага галоўнага суб'екта гісторыі, які пераўтварыўся ў галоўны аб'ект дзейнасці германскіх гаспадарчых службаў, якія забяспечвалі мясцовай працоўнай сілай розныя акупацыйныя установы, інстытуты і службы. Між тым, выяўленыя факты малююць толькі першы погляд на праблему выкарыстання мясцовай працоўнай сілы, без чаго будзе надалей практычна немагчыма рэканструяваць агульную карціну гісторыі працоўных рэсурсаў у акупаванай Беларусі. Вядучай лініяй пры гэтым мы разглядаем факт кааперацыі з акупацыйнай германскай уладай у сферы працы. Гэта азначае, што для ўсебаковага разгляду гэтай праблемы нам неабходна правядзенне падобных даследаванняў з мэтай напісання агульнай карціны тых падзей на аснове асабовых звестак, канкрэтных імёнаў і дакладных фактаў.

Выкарыстанне новых дакументаў дазваляе не толькі значна пашырыць дакументальную базу для вывучэння асобных старонак гісторыі, але і ўнесці важныя ўдакладненні ў сучасную беларускую гістарыяграфію з мэтай максімальнай поўнай рэканструкцыі падзей сацыяльнай гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Выявіць новыя гістарычныя факты для ўсебаковага даследавання праблем працоўнай паўсядзённасці грамадзянскага насельніцтва магчыма на аснове больш крытычнага выкарыстання вядомых дакументальных крыніц і фарміравання новага інфармацыйнага кантэнту шляхам увядзення малавядомых нямецкамоўных матэрыялаў, без чаго на цяперашні час немагчыма правядзенне аб'ектыўнага навуковага даследавання.

Аналіз эмпірычных фактаў, выяўленых у матэрыялах калекцыі дакументаў Генеральнага камісарыята «Беларусь», сведчыць аб невычэрпнасці крыніцазнаўчага патэнцыялу, які захоўваюць арыгінальныя нямецкія дакументы, пакуль не ў дастатковай меры выкарыстаныя даследчыкамі для ўсебаковага вывучэння сацыяльнай гісторыі працоўнай паўсядзённасці грамадзянскага насельніцтва Беларусі ў 1941–1944 гг.


1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). – Ф. 370. – Воп. 1. – Спр. 1395.
2. Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны: в 3 т. / Гл. редкол. : А. Т. Кузьмин [и др.]. Т. 1. – Минск: Беларусь, 1983. – 591 с.
3. Стенограмма совещания высшего руководства Генерального округа «Белоруссия» (Минск, 8–10 апреля 1943 г.) / авторы-сост. С. В. Жумарь, С. Е. Новиков, Р. А. Черноглазова; пер. с нем. Г. Г. Белькевич, О. А. Лойко, С. Е. Новиков, С. П. Павловицкий. – Минск: МГЛУ, 2006. – 220 с.
4. *Dien, M.* Ghetto im Generalkommissariat Weißruthenien / M. Dien // Reichskommissariat Ostland. Tatort und Erinnerungsobjekt / hrsg. durch Sebastian Lehmann gemeinsam mit Robert Bohn und Uwe Danker. – Paderborn; München; Wien; Zürich : Ferdinand Schöningh, 2012. – S. 89–100.
5. НАРБ. – Ф. 370. – Воп. 1. – Спр. 1395. – Bl. 1–162: Protokoll über die Tagung der Gebietskommissare, Hauptabteilungsleiter und Abteilungsleiter des Generalkommissars in Minsk vom 8. April bis 10. April 1943.
6. Жумарь, С. В. Стэнаграма нарады вышэйшага кіраўніцтва Генеральнай акругі Беларусь. Мінск, 8–10 красавіка 1943 г. [прадмова, каментарыі, навуковае рэдагаванне і археаграфічная падрыхтоўка тэксту дакумента] // Arche. – 2010. – № 7–8. – С. 270–485.
7. Латвійскі дзяржаўны гістарычны архіў (далей – LVVA). – P-70. Ap. 5. Nr.13: Der Reichskommissar für das Ostland: Arbeitseinsatz: Vermerk für Herrn Gauleiter Lohse, Anlage I: Kräftebedarf im Ostland, v. 1.11.1943.




Рэпазіторый ВДУ

8. Gerlach, Ch. Kalkulierte Morde. Die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weißrußland 1941–1944 / Ch. Gerlach. – Hamburg: Hamburger Edition, 2000. – 1232 S.
9. Архіў Інстытута найноўшай гісторыі ў Мюнхене (далей – A IfZ). ED 2/I, Bd. 2: Kriegswirtschaft im Operationsgebiet des Ostens in den Jahren 1941–1943.
10. НАРБ. – Ф. 370. – Воп. 1. – Спр. 1628: Die Aufstellung für die beim Generalkommissar im Minsk beschäftigten einheimischen Arbeitskräfte vom 1.01.1943. – Bl. 12–29.
11. Літвін, А. М. Вяртанне ў рабства: прымусовая праца насельніцтва Беларусі 1941–1945 гг. / А. М. Літвін, Я. А. Грэбень, С. Я. Новікаў; агул. рэд. А. М. Літвіна. – Мінск: Тэсей, 2010. – 584 с.

**Цымбал А.Г.**

## ВЫКАРЫСТАННЕ ПРАЦОЎНЫХ РЭСУРСАЎ НА АКУПАВАНАЙ ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў СВЯТЛЕ КАЛЕКЦЫІ ДАКУМЕНТАЎ ГЕНЕРАЛЬНАЙ АКРУГІ БЕЛАРУСЬ

Дакументальная спадчына акупацыйных структур Генеральнага камісарыята Беларусь (ГКБ), змешчаная ў Калекцыі дакументаў Генеральнай акругі Беларусь (фонд 370 Нацыянальнага архіву Рэспублікі Беларусь), уяўляе сабой выключны па значнасці і мала даследаваны комплекс дакументаў, які змяшчае багаты фактычны матэрыял датычны жыцця насельніцтва Беларусі перыяду германскай акупацыі. Установа ажыццяўляла функцыі грамадзянскай адміністрацыі на частцы беларускіх зямель і з’яўлялася ключавым выканаўцам акупацыйнай палітыкі. Матэрыялы Калекцыі даюць уяўленне аб шматлікіх аспектах акупацыйнага жыцця праз прызму дзейнасці акупацыйнай адміністрацыі і праліваюць святло на шматлікія “белыя плямы" выкарыстання эканамічнага патэнцыялу і штодзённага жыцця насельніцтва Беларусі ў гады германскай акупацыі.

Працоўныя рэсурсы з’яўляліся адным з галоўных аб’ектаў інтарэсу акупацыйных структур. Дакументальныя матэрыялы ўтрымліваюць інфармацыю адносна колькасці работнікаў заняных у прамысловасці. Асаблівую цікавацьуяўляе кампаратыўны аспект статыстычных даных па акрузе Беларусь і Балтыйскіх генеральных акругах на 1942 г.У акрузе Латвія налічвалася 109 тыс. рабочых, Эстонія – 53 623, Літва – 33 453, Беларусь – 11 575 рабочых. Доля Беларусі ад агульнай колькасці працаўнікоў, занятых у прамысловасці на усёй тэрыторыі Остланд, складала 5,7% [1, арк. 88-90].

Паказчыкі абароту ў сферы прамысловасці ў тым жа 1942 г. складалі ў Генеральнай акрузе Беларуь 8 761 905рэйхсмарак (РМ). У той час як па Балтыйскім генеральным акругам: Латвія – 344 969 000 РМ, Эстонія – 139 976 000 РМ, Літва – 250 578 000 РМ. Доля генеральнай акругі Беларусь ў прамысловай вытворчасці адносна абароту складала 10% [1, арк. 88–90]. Пры гэтым, акупацыйныя ўлады адзначалі, што па Беларусі трэба было ўлічваць, што гаворка ішла аб мностве рамонтных майстэрань пры прадпрыемствах у Беларусі, якія па сваіх паказчыках з’яўляліся ўскоснымі.

Праблему выкарыстання працоўных рэсурсаў акупаванай Беларусі крыніцы Калекцыі раскрываюць таксама праз прызму дзейнасці бірж працы.

Як пісалася ў нямецкіх дакументах: “Мы павінны імкнуцца да таго, каб псіхалагічна правільна настроіць мясцовае насельніцтва. Калі гэта разнастайнасць умоў будзе выканана, тады стане магчымым перадаць Рэйху ў распараджэнне вялікую колькасць усходніх рабочых, а таксама нямецкай індустрыі, якая з-за налётаў бамбардзіроўшчыкаў павінна вытрымаць цяжкія выпрабаванні і якая ў сувязі з пастаяннай мабілізацыяй нямецкіх рабочых сіл у шэрагі вермахта перажывае крытычныя часы. Мы павінны імкнуцца да таго, каб ва ўласнай эканоміцы дасягнуць павышэння прадуктыўнасці працы сярод беларускіх рабочых, каб, магчыма ня значны эканамічны сектар Беларусі, ўсё-такі па сваіх сілах, па сваёй сыравіне і г.д. мог зрабіць значны вайскова-эканамічны ўнёсак” [2, арк. 78].

Так, у справаздачы аб выніках дзейнасці бірж працы ў Генеральнай акрузе Беларусь ад 9 красавіка 1943 г. паведамлялася, што за тры месяцы 1943 г. было адпраўлена ў Германію 4 тыс. чалавек, што лічылася добрым паказчыкам, але рабілася гэта пры дапамозе паліцыі і войска. Нават германскія ўлады прызнавалі, што мясцовыя работнікі да працы ў Рэйху ставіліся як да высылкі ў Сібір. Нягледзячы на актывізацыю прапагандыфактам заставалася дрэннае абыход-



Рэпазітор ВДУ